XXI ст. забудову горада пачынаюць разумець як напластаванне розных культур, эпох, тэкстаў. Таму варта больш пільна паглядзець на архітэктурную спадчыну, паспрабаваць захаваць аб'екты розных гістарычных перыядаў, вылучыць і падкрэсліць іх адметнасці.

*Літаратура*

1. *Воинов А.А. История архитектуры Белоруссии (советский период). Мн.: Вышэйшаая школа, 1975.-216 с..*
2. *В тени Лангбарда. Каким мог быть Минск, если бы его построили авангардисты [Электронный ресурс] // TUT.BY. – Режим доступа: https://news.tut.by/culture/537344.html – Дата доступа: 25.03.2019.*
3. *Дзяржаўны архіў навукова-тэхнічнай дакументацыі. – Ф.3. – Воп.1, 3, 4.*

**THE HISTORY OF THE BUILDING OF INDEPENDENCE AVENUE IN MINSK IN THE 20-50-TH OF XX CENTURY: MODERNIST AND TRADITIONAL URBAN STRATEGY**

**E. Morozow**
**PhD, associate professor of the Department of Architectural Environment Design**
**Belarusian National Technical University**

The article analyzes the development of the modern Independence Avenue in the 20-50-ies of the Twentieth century. The modernistic and traditional strategies of its formation are highlighted. The author reconstructs the history of separate buildings, reveals their role in the formation of the ensemble at the time of their appearance and in the path of further stages of reconstruction.

*Поступила в редакцию 31.01.2020 г.*

УДК 272-789.5-523-9"17/20"

# МУРАВАНЫЯ КАПЛІЦЫ НЯСВІЖСКІХ ЕЗУІТАЎ ПАЧАТКУ XVII СТ.*

**Мяцельскі А.А.**
доктар гістарычных навук, загадчык аддзела гістарыяграфіі і метадаў гістарычнага даследавання
Інстытут гісторыі НАН Беларусі

*Артыкул прысвечаны лёсу мураваных касцёлаў і капліц нясвіжскага езуіцкага калегіума, размешчаных у наваколлях Нясвіжа і пабудаваных ў часы нясвіжскага ардыната Мікалая Крыштафа Радзівіла Сіроткі ў канцы XVI – пачатку XVII ст.*

*Уводзіны*. Нясвіжскі калегіум ордэна езуітаў, уфундаваны князем Мікалаем Крыштафам Радзівілам Сіроткам у 1584 г., акрамя свайго галоўнага храма "Божага Цела" меў у Нясвіжы і яго наваколлях яшчэ пляцоўкі з мураванымі храмамі; касцёл св. Міхала на Міхалавай гары пад Нясвіжом, капліцу св. Лазара на Новым месце Нясвіжа і капліцу ў в. Ужанка Нясвіжскага раёна. Калі першыя дзве пляцоўкі не захаваліся да нашых дзён, то капліца ў в. Ужанка, не зразумела па якіх прычынах, засталася незаўважанай даследчыкамі [1, с. 73; 2, s. 90, mal. 85], і таксама лічыцца знішчанай, хаця на самой справе існуе да сённяшняга дня.

*Асноўная частка*. Пасля будаўніцтва касцёла "Божага Цела" самай першай пляцоўкай, якую пачаў будаваць у Нясвіжы князь Мікалай Радзівіл Сіротка, і якая належала ордэну езуітаў, была капліца св. Рафала, абаронцы вандраўнікоў, якую М.К. Радзівіл Сіротка даў абет пабудаваць яшчэ напярэдадні пілігрымкі ў Святую Зямлю ў 1583–1584 гг. Але справа да фундуша на будаўніцтва капліцы дайшла толькі ў 1593 г. Саму ж капліцу пачалі будаваць толькі у 1598 г., і ў яе будаўніцтве прыняла непасрэдны ўдзел княская сям'я. Капліца была пабудавана на працягу 10 дзён, і ўжо 28 ліпеня 1598 г. жмудскі біскуп Мельхіёр Гедройц асвяцыў яе алтар, але ў 1599 г. яна была пераасвечана ў гонар св. Міхала [2, s. 70, 73].

Першапачаткова капліца св. Міхала мела невялікія памеры: згодна з апісаннем і планам апублікаваным Я. Аландам, яна мела форму выцягнутага прамакутніка памерамі 9 х 13 локцяў, альбо 7,8 х 5,4 м, і на думку некаторых даследчыкаў у яе праектаванні прыняў непасрэдны удзел Я.М. Бернардоні [2, s. 70–71; 3, k.2; 4, s. 202]. Але хутка

*Артыкул падрыхтаваны ў межах выканання праекта БРФФД № Г18Р-271

пасля смерці князя М.К. Радзівіла Сіроткі капліца была павялічана ў памерах і стала прэзбітэрыем у касцёле, а ў XVIII ст. касцёл св. Міхала яшчэ раз быў павялічаны ў памерах. Касцёл св. Міхала заставаўся адным з самых пачытаемых месц сям'і Радзівілаў, але ў XIX ст. пасля касацыі ордэна езуітаў у ім былі размешчаны армейскія казармы, а на пачатку XX ст. касцёл разам з кляштарам быў знішчаны, і зараз яд аго захаваліся толькі фрагменты падвалаў.

Другой па чарзе будаўніцтва пляцоўкай нясвіжскіх езуітаў з'яўлялась капліца св. Лазара, якая знаходзілася на Новым месцы горада. Яе пачалі будаваць у 1600 г. і яна паказана на гравюры Т. Макоўскага з выявай Нясвіжа [5]. Капліца паказана на плане Нясвіжа 1796 г. на гарадскіх могілках, і на думку Т. Бернатовіча, з самага пачатку была капліцай на могілках, альбо была звязана з гарадскім шпіталем [2, s. 89].

Капліца св. Лазара, але ўжо пад назвай капліца св. Ізыдора, перажыла Другую Сусветную вайну, і разам з Георгіеўскай царквой (былым па-бернардзінскім касцёлам), была знята з уліку як помнік архітэктуры 29 лістапада 1950 г. [6], што дазволіла ў канцы 80–90-х гадах XX ст. яе разбурыць, а яе плац перадаць пад гарадскую забудову. Зараз на месцы былой капліцы знаходзіцца сядзіба жыхара Нясвіжа (вуліца М. Горкага 11), які ўстанавіў на месцы капліцы крыж.

Акрамя гравюры Т. Макоўскага адзінымі крыніцамі, якія дазваляюць зрабіць ўяўленне пра капліцу св. Ізыдора, застаюцца яе фатаздымкі пачатку – сярэдзіны XX ст. [2, s. 89; 7] (мал. 1) і абмеры, зробленыя ў 1949 і ў 1954 гг. (мал. 2).

Згодна з гэтымі абмерамі капліца св. Лазара (Ізыдора) была невялікай прамакутнай ў плане пабудовай памерамі каля 8,2 х 6 м, з двумя вокнамі па баках, завершаных паўкруглымі аркамі. На фасадзе капліцы былі падвоеныя вароты шырынёй 2 м, над якімі знаходзілася акно квадратнай формы памерамі каля 1 х 1 м, завершанае паўкруглай аркай. Па цэнтры трохвугольных франтонаў з абодвух бакоў знаходзіліся круглыя вокны дыяметрам каля 1 м. Апсіды каплічка не мела [8]. Хто быў аўтарам праекта гэтай капліцы невядома.



Мал. 1. Фатаграфія 1949 г. капліцы св. Ізыдора.



Мал. 2. Архітэктурныя абмеры 1954 г. капліцы св. Ізыдора

Яшчэ адной пляцоўкай нясвіжскіх езуітаў, дзе існавала мураваная капліца, быў іх фальварак у в. Ужанка. Сёння ў аднайменнай вёсцы Нясвіжскага раёна існуе мураваная капліца Маці Божай Вастрабрамскай (мал. 3), якая адносіцца да Гарадзейскай парафіі св. Юзефа.

Сучасная касцёльная хроніка капліцы ў в. Ужанка вядзе пачатак сваёй гісторыі толькі з 1881 г., хаця у публікацыях сярэдзіны XIX ст. мы сустракаем звесткі аб тым, што яе гісторыя пачалася з больш ранняга часу. Так, У. Сыракомля згадвае наяўнасць ва Ужанцы касцёла ў сярэдзіне

XIX ст. [9, с. 50], а ў Расійскім дзяржаўным архіве старажытных актаў захоўваецца інвентар фальварка Ужанка нясвіжскага езуіцкага калегіума, складзены 20 кастрычніка 1773 г., у якім адзначаецца, што на той час тут быў невялікі касцёл у гонар Яна Хрысціцеля, кароткая візітацыя якога падаецца ў інвентары [10, арк. 3–5].



Мал. 3. Капліца ў в. Ужанка.

Ужанка ўпершыню згадваецца ў 1560 г. у сувязі з наданнем вялікім князем Жыгімонтам Аўгустам князю Мікалаю Радзівілу Чорнаму двух валок зямлі “на Ужанцы” [11, с. 618; 12, с. 94]. А ўжо 10 жніўня 1584 г. падчас выдачы фундуша на заснаванне ў Нясвіжы езуіцкага калегіума, вёска Ужанка, разам з сучаснай в. Рудаўкай (былое сяло Рудавае), была ўфундавана калегіуму М.К. Радзівілам Сіроткам[13, арк. 3, 40]. Безумоўна, улічваючы, што гэтыя вёскі сталі ўладанем ордэна езуітаў, то ў іх павінны былі існаваць, як мінімум, драўляныя каталіцкія капліцы з самага пачатку пераходу іх пад уладу езуітаў. Аднак крыніцы аб гэтым пакуль невядомы. Інвентар фальварка Рудаўка ад 24 кастрычніка 1773 г. адзначае ў ім толькі мураваны будынак резыдэнцыі, а пра касцёл альбо капліцу,нічога не паведамляе. З іншага боку гэта і не дзіўна, бо да нясвіжскага касцёла ордэна езуітаў адсюль усяго толькі 3,5 кіламетры і на службу можна было хадзіць у галоўны храм.

Іншая сітуацыя складвалася з уладаннем нясвіжскіх езуітаў ва Ужанцы. Адразу прыцягвае ўвагу той факт, што ў 1773 г. тут ужо быў невялікі касцёл (kościolak) у гонар Яна Хрысціцеля. Улічваючы, што галоўнымі фундатарамі езуітаў, як і астатніх каталіцкіх ордэнаў, што дзейнічалі ў Нясвіжы і яго наваколлях былі князі Радзівілы, то адразу ж узнікае пытанне, а ці не прымалі яны ўдзел у будаўніцтве касцёла ва Ужанцы, і калі гэта магло адбыцца?

Дакладна вядома пра будаўніцтва князем М.К. Радзівілам Сіроткай акрамя касцёлаў і кляштараў у Нясвіжы, капліцы св. Міхала, мураваных касцёлаў у Міры, Чарнаўчыцах, Свержані і ў Дзераўной [4, s. 282]. Але аб будаўніцтве касцёла ў Ужанцы нічога не вядома.

Сёння капліца ў в. Ужанка мае прамакутную форму памерамі 11,78 x 7,93 м (мал. 4) з апсідай радыюсам каля 2 метраў, якая прымыкае да асноўнага аб’ёма капліцы з паўночна-усходняга боку. Да апсіды з усходняга боку прымыкае яшчэ адно памяшканне паўкруглай формы агульнай плошчай каля 11 м$^2$, якое выконвае ролю сакрыстыі. Але адразу бачна, што гэта больш позняя прыбудова да капліцы, якая першапачаткова не існавала (мал. 4; 5а).

Капліца асвятляецца з дапамогай чатырох прамавугольных вокнаў з паўкруглым завяршэннем, па два вакны на кожнай сцяне. Перакрыццё капліцы выканана двумя цыліндрычнымі скляпеннямі з распалубкамі, над якімі ўзвышаецца дах. Вышыня капліцы каля 9 м., з якіх 3 м прыпадаюць на трохкутны франтон, які аддзелены ад асноўнага аб’ёма карнізам. У верхняй частцы франтона захавалася ляпніна ў выглядзе круга ў які ўстаўлены скарочаны лацінскімі надпіс «IHS» –Iesus Hominum Salvator (Ісус, збаўца чалавецтва) (мал. 4).

Сёння капліца абкладзена амальз усіх бакоў сучаснай цэглай, што з’яўляецца вынікам ратавальных прац, якія былі выкананы ў 1990 г. жыхарамі в. Ужанка. Але захаваўшыяся фатаздымкі гэтага рамонта паказваюць некаторыя важныя, але зараз страчаныя дэталі гэтай капліцы.

Так на адным з фатаздымкаў 1990 г. выразна бачны з абодвух бакоў ад дзвярэй, закладзеныя ўжо ў той час нішы ў якіх размяшчаліся статуі святых.



Мал. 4. Капліца ў в. Ужанка. Выгляд збоку апсіды

Капліца ў 1990 г. патрабавала тэрміновага рамонта, бо яе сцены былі ў шчылінах, але наколькі такі варыянт іх умацавання (абкладка са знешняга боку сучаснай цэглай) можна прызнаць удалым, цяжка сказаць. Тым болей, што некаторыя шчыліны так і не былі ўмацаваны і існуюць да сённяшняга дня. З іншага боку, выкананы рамонт зараз не дазваляе са знешняга боку прасачыць памеры цэглы, з якой была пабудавана капліца і тэхніку яе кладкі. Толькі ў адным месцы на апсідзе, якое не было абкладзена сучаснай цэглай і адвалілася тынкоўка, удалося прасачыць памеры цэглы – 26,5х13х6,5 см., што адпавядае памерам цэглы, якая выкарыстоўвалася пры будаўніцтве замка ў Нясвіжы. Цэгла падобных памераў была зафіксавана і ў мураваным алтары капліцы. Такім чынам, гэта дазваляе ставіць пытанне, а ці не з'яўляецца сучасная капліца ў в. Ужанка раней невядомым помнікам архітэктуры пачатку XVII ст.?

У сувязі з гэтым трэба звярнуць увагу на так званы альбом праектных чарцяжоў Я.М. Бернардоні, дзе на абароце 5 аркуша намаляваны праект прамакутнага касцёла, пад праектам якога напісана: "Fundamenta kosczołka tego, ten jest urobioni f wolwarku kole[g]yum nieswizskiego, ma na dluz kosc [sic] lokszi 22 na serkosc lokczi 12" [14, s. 103 № 12, мал. 12] (мал. 5б).



а б

Мал. 5. Сумяшчэнне планаў капліц:
а – сучасны план капліцы ў в. Ужанкі;
б – праектны план капліцы XVII ст. у фальварку нясвіжскіх езуітаў

Хаця ў надпісу не сказана ў якім фальварку нясвіжскага калегіума былі закладзены падмуркі гэтага касцёла, але яго агульны план і памеры адпавядаюць плану і памерам сучаснай ужанкаўскай капліцы. Больш таго, на гэтым праектным плане касцёла паказаны і нішы для ўстаноўкі статуй святых, якія бачны як закладзеныя на адным з фатаздымкаў, выкананых падчас рамонту 1990 г. На захаваўшымся плане ў алтарнай частцы касцёла паказаны дзве нішы. І ў алтарнай частцы ужанкаўскай капліцы, з левага боку ад алтара, захавалася ў сцяне ніша памерамі 0,58 х 0,77 см і глыбінёй 0,5 м. А з правага боку ад алтара ніша была знішчана падчас прыбудовы сакрыстыі.

Усе гэтыя агульныя рысы, якія адзначаюцца ў праектным плане касцёла і сучаснай капліцкі ў в. Ужанка, дазваляюць выказаць меркаванне, што на плане з так званага альбома Я.М. Бернардоні паказаны касцёл, які быў пабудаваны ў фальварку нясвіжскага езуіцкага калегіума, і які захаваўся да нашых дзён у некалькі змянённым выглядзе. І хаця ў сучасных каментарыях, напісаных пад планам касцёла, гаворыцца, што гэта касцёл пры шпітале св. Лазара, пабудаваны ў 1600 г. на фальварку езуітаў у Нясвіжы [14, s. 103], але на самой справе касцёл ( капліца) св. Ісідара была пабудавана на Новым месцы Нясвіжа па зусім іншым праекце.

Калі быў пабудаваны касцёл (капліца) ва Ужанцы, зараз цяжка сказаць. Хутчэй за ўсё, яго праект быў складзены яшчэ на пачатку XVII ст., магчыма, падчас гаспадарання ў Нясвіжы М.К. Радзівіла Сіроткі. Але больш дэталёва аб гэтым можна будзе казаць толькі пасля мэтанакіраваных археалагічных і архіўных даследаванняў.

Тым не менш, ужо зараз выразна прасочваюцца два этапы ў яго развіцці. Першы адносіцца да часоў будаўнітцва яго асноўнага аб'ёма, а другі тычыцца часу прыбудовы памяшкання сакрыстыі да асноўнага аб'ёма касцёла.

Яе яшчэ няма на праектным плане, не згадваецца яна і ў апісанні касцёла Яна Хрысціцеля 1773 г. Але ў той самы час у інвентары фальварка 1773 г. згадваецца вялікая колькасць рэчаў, што захоўвалася ў сакрысцыі. І дакладна пералічваюцца рэчы, якія адносяцца да таго ці іншага алтара касцёла. Таму можна меркаваць, што да 1773 г. сакрысцыя пры касцёле ўжо існавала. І тады час яе будаўніцтва, хутчэй за ўсё, трэба аднесці альбо да часоў адраджэння фальварка і касцёла пасля вайны 1654–1667 гг., калі Нясвіж і яго наваколлі два разы нішчылі рускія войскі, альбо гэта магло адбыцца пасля шведскага пагрома Нясвіжа і яго наваколляў 1706 г.

*Заключэнне.* Такім чынам, акрамя галоўнага касцёла ордэна езуітаў, у наваколлях Нясвіжа, пры князі М.К. Радзівіле Сіротцы былі пабудаваны мураваныя капліцы на Новым месцы Нясвіжа, у в. Ужанка і капліца св. Міхала, з якіх да нашых дзён дайшоў толькі помнік у в. Ужанка. Існаванне раней невядомага помніка архітэктуры XVII ст., які не знаходзіцца на дзяржаўным уліку, выклікае занепакоенасць і патрабуе ад Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь тэрміновых дзеянняў па пастаноўцы помніка на дзяржаўны ўлік як аб'екта нерухомай гісторыка-культурнай спадчыны, яго паўнавартаснага абследвання, і прыняцця мер па захаванні яго стана.

*Літаратура і крыніцы*


1. *Габрусь, Т. Праверенная алгебрай гармонія / Т. Габрусь, Г. Галенченка // Мастацтва Беларусі. – 1990. – № 5. – С. 70–73.*
2. *Bernatowicz, T. Miles Christian uset peregrinus. Fundacje Mikołja Radziwiłła "Sierotki" w ordynacji Nieświeskiej. / T. Bernatowicz – Warszawa, wyd-wo Neriton, 1998.*
3. *Aland, J. O cudach śś. Aniolów Bożych w kościole S. Michala Archaniola blisko Nieświeża w Litwie dziejących się. / J. Aland – Wilno, 1636.*
4. *Paszenda,J. BudowlejezuickiewPolsce. T. 1. / J. Paszenda – Kraków, 1999. – 460 s.*
5. *Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі. – Фонд 694, вопіс 2, адзінка захоўвання № 4959.*
6. *Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. – Фонд 903, вопіс 1, адзінка захоўвання № 251.*
7. *Капліца св. Ізыдора ў Нясвіжы – рэжым доступу - http://radzima.org/be/object/8895.html - дата доступу 11.01.2020.*
8. *Беларускі архіў навукова-тэхнічнай дакументацыі. – Фонд 302, вопіс 5, адзінкі захоўвання №№ 101, 102-1, 102-2.*
9. *Сыракомля, У. Вандроўкі па маіх былых ваколіцах. Успаміны, даследаванні гісторыі і звычаяў. / У. Сыракомля – Мн.: Полымя, 1992 – 156 с.*
10. *Расійскі дзяржаўны архіў старажытных актаў. – Фонд 1603, вопіс 1, адзінка захоўвання № 37.*
11. *Ужанка // Памяць: Гісторыка-дакуметальная хроніка Нясвіжскага раёна. – Мн. : БелЭн., 2001. С. 618.*
12. *Ужанка // Гарады і вёскі Беларусі: энцыклапедыя. Т. 8. Мінская вобласць. Кн. 4. – Мн. : Бел. Энцыкл. імя П. Броўкі, 2013. С. 94.*
13. *Расійскій дзяржаўны архіў старажытных актаў. – Фонд 1603, вопіс. 1, адзінка захоўвання № 51-А.*
14. *L'architetto Giaan Maria Bernardoni sj tra i'Italia e le terre dell'Europa centro-orietale. A curadi Sante Gracciotti e Jerzy Kowalczyk. – Roma, MCMIC. – 180 s.*


**STONE CHAPELS OF THE NESVIZH JESUITS (THE BEGINNING OF THE 17TH CENTURY)**

**Miacelsski A.A.**
**Institute of History of the National Academy of Sciences of Belarus**

Nesvizh Collegium of the Jesuits, in addition to its main Church "God's Body" was in the vicinity of Nesvizh still several sites with stone temples of the XVII century: the Church of St. Michael on Mihajlovojmountain near Nesvizh, the chapel of St. Lazare in a New place Nesvizh and the chapel in the willageUzankaNesvizh district. When the first two churches were not preserved, the kaplichka in the village of Uzhanka exists, but to this day, it is not clear for what reasons remains unnoticed by historians of architecture, although it is a monument of the beginning of the XVII century.

*Поступила в редакцию 15.01.2020 г.*